***А. У. Дрывайла***
*Навук. кір.* ***В. С. Новак,***
*д-р філал. навук, прафесар*

# ЗАМОЎНАЯ ТРАДЫЦЫЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БРАГІНСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Спакон веку замоўныя формулы, якім надавалася магічная сіла ўздзеяння, заключалі ў сабе каштоўную і багатую інфармацыю пра жыццё нашых продкаў і іх светапогляд. Замовы ўзніклі яшчэ тады, калі слову надавалася магічнае практычнае значэнне, калі верылі, што пры дапамозе славеснага ўздзеяння можна як выклікаць ці знішчыць нейкую з'яву, так і дасягнуць пэўных станоўчых дзеянняў. Аўтэнтычныя матэрыялаў па замоўнай творчасці, сабраныя ў 2018 г. падчас фальклорнай экспедыцыі на тэрыторыі Брагінскага раёна, дапамагаюць выявіць, што гэты від абрадавага фальклору з'яўляецца ў мясцовай традыцыі надзвычай устойлівым жанрам вуснай народнай творчасці. У пераліку замоў брагінскай калекцыі сустракаюцца тэксты гаспадарчых і любоўных, а таксама замоў сацыяльна-грамадскай скіраванасці. Найбольшай у колькасных адносінах з'яўляецца лекавая група замоў.

Нашы продкі лічылі, што хваробу можна было адаслаць, выгаварыць пры дапамозе замоўнага слова, спалучанага з пэўнымі дзеяннямі. Невыпадковымі ў тэкстах замоў былі звароты да нябесных свяціл, прыродных з'яў і стыхій, боскіх сіл. Заслугоўваюць увагі розныя функцыянальна-тэматычныя групы лекавых замоў, запісаных на тэрыторыі Брагінскага раёна: гэта замовы ад крывацёку, грыжы, скулы-залатухі, лішая, суроку, харобы вачэй, зубнога болю, ячменю, ліхаманкі, рожы і інш.

У шматлікіх мясцовых запісах прадстаўлены цікавыя варыянты замоў ад крывацёку, у якіх людзі імкнуліся спыніць кроў з дапамогай магічнага ўздзеяння словам. Варта падкрэсліць, што ў тэкстах замоў сустракаюцца як язычніцкія, так і хрысціянскія элементы. Што да апошніх, то выкарыстоўваюцца ў замоўных сюжэтах такія персанажы, як «Бог», «Святая Прычыстая», «Гасподзь», да якіх звяртаюцца за дапамогай і парадамі.

Прааналізаваныя тэксты лекавых замоў, сабраных на тэрыторыі Брагінскага раёна, даюць магчымасць канстатаваць, што амаль ва ўсіх тэкстах маюць месца хрысціянскія матывы і персанажы: «*Госпадзі Божа, благаславі….*» [1, с. 221], «*Госпаду Богу памалюся, Мацеры Святой Прачыстай пакланюся….*» [1, с. 109], «*Гасподухна міласцівы, паможы мне…*» [1, с. 245-256]. Варта адзначыць, што вялікая колькасць лекавых замоў пачынаецца са слоў: «*Первым разам, божым часам Госпаду Богу памалюся, Святой прачыстай пакланюся*» [1, с. 295].

Сярод мясцовых запісаў сустракаюцца такія ўнікальныя тэксты замоў, як *«Ад тараканаў», «Ад нарадкі», «На суд», «Ад лесуна», «Ад ангіны», «Замова на тое, каб з кіраўніцтвам ладзіць», «На прыдбанне поспеху».*

Знаёмства з сюжэтамі, матывамі, вобразна-мастацкай сістэмай замоў пераконвае ў важнасці спасціжэння народнай мудрасці, карціны свету, створанай і захаванай у стагоддзях беларусамі, у прыватнасці жыхарамі Брагіншчыны.

## Літаратура

1 «Гаючае слова роднай зямлі»: беларускія лекавыя замовы: фальклорна-этнаграфічны зборнік / аўтар уступнага артыкула, аўтар-укладальнік С. А. Вяргеенка. – Гомель : Барк, 2013. – 340 с.

РЭПОЗІТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ